Народная Асвета

ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ

Тэматычны модуль для падрыхтоўкі педсаветаў, арганізацыі метадычнай работы, самаадукацыі, вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці

Праект заснаваны ў 2010 г.

# ПАСЯДЖЭННЕ 52. КУЛЬТУРА ЧЫТАННЯ ЯК САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫ ФЕНОМЕН

**Яшчэ зусім нядаўна нашы суайчыннікі толькі марылі пра ўсеагульную пісьменнасць і, не шкадуючы сіл, набліжалі яе. (Зусім нядаўна, бо нейкіх 70–80 гадоў – кропля ў маштабе 10 тысячагоддзяў, якія налічвае еўрапейская культура.) І здавалася б, нашы дзяды і прадзеды, што шчыравалі ў камітэтах па ліквідацыі непісьменнасці і хатах-чытальнях, сёння маглі б ганарыцца вынікам сваіх намаганняў і радавацца за спрэс пісьменных нашчадкаў. Маглі б?**

**Сталічная гімназія. Восьмы клас. Вучань піша сачыненне па рускай літаратуры, прысвечанае творчасці А. С. Пушкіна. Цытата: *«Пушкин дрался на дуэли с Наполеоном из-за девушки»*.**

**Сярэдняя агульнаадукацыйная школа. Адзінаццаты клас. Настаўніца задае на дом заданне вывучыць верш аднаго з паэтаў Сярэбранага веку і просіць вучняў папярэдзіць яе, хто якога паэта выбраў. Адзін з юнакоў дзелавіта паведамляе: «Я буду вучыць верш *Марыі Цвятковай*».**

**Філалагічны факультэт ВНУ. Першы курс. Выкладчык прапануе студэнтам вызначыць род слоў «Сібір», «Тбілісі», «Антарыя», «кенгуру» і г. д. Каб выканаць гэтае, здавалася б, нескладанае заданне, трэба ўсяго толькі ведаць значэнне прапанаваных слоў. Якім жа было здзіўленне выкладчыка, калі студэнты адзін за адным пачалі пытацца: «Сібір – гэта горад?», «Тбілісі – здаецца, гара?».**

**Як давесці сучасным маладым людзям, што найвялікшае дасягненне нашай дзяржавы – усеагульную пісьменнасць – мэтазгодна выкарыстоўваць не толькі для абмену sms-паведамленнямі з сябрамі і кантактавання ў «Аднакласніках»? Як пераканаць дзяцей і падлеткаў, што чытанне кніг сапраўдных пісьменнікаў адточвае інтэлект, вучыць разбірацца ў людзях, дапамагае выстаяць у цяжкіх абставінах? На гэтыя і іншыя пытанні, актуальныя не толькі для настаўнікаў-славеснікаў, мы паспрабавалі адказаць у чэрвеньскім выпуску «Педагагічнай асамблеі».**

***Галіна Пшонік,***
***рэдактар аддзела***

# Фарміраванне культуры чытання як педагагічная праблема

## Стратэгія псіхолага-педагагічнага ўплыву на юнага чытача



**Н. У. Клімянкова,**
прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Істотныя змены ў інфармацыйнай, сацыякультурнай і адукацыйнай прасторы прывялі да ўзнікнення відавочнай супярэчнасці паміж інтэнсіўным развіццём інфармацыйных тэхналогій, наяўнасцю свабоднага доступу да любой інфармацыі і псіхафізіялагічнымі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**магчымасцямі дзяцей і падлеткаў успрымаць, асэнсоўваць, разумець і ацэньваць яе. Невыпадкова сутнасць і прырода чытання, яго ўплыў на развіццё асобы сёння сталі прадметам спецыяльных даследаванняў псіхолагаў, педагогаў, сацыёлагаў, бібліятэказнаўцаў. Вынікі гэтых даследаванняў сведчаць: чытанне спрыяе фарміраванню здольнасці мысліць катэгорыямі, вучыць абагульняць і аналізаваць, устанаўліваць сувязі паміж разнароднымі з'явамі, а значыць, адэкватна ацэньваць жыццёвыя сітуацыі і знаходзіць аптымальнае выйсце з іх. Акрамя таго, чалавек, у якога сфарміравана культура чытання, вылучаецца большым аб'ёмам памяці, актыўным творчым уяўленнем. Яго мова больш выразная, запас слоў – больш багаты, думка фармулюецца больш дакладна і свабодна. Начытаныя людзі, як правіла, не адчуваюць цяжкасцей з састаўленнем пісьмовых тэкстаў, лёгка ўступаюць у кантакты і больш прывабныя ў зносінах. Чытанне таксама спрыяе развіццю здольнасці да крытычнага мыслення, імкнення да незалежнасці і ўнутранай свабоды, самастойнасці ў меркаваннях і паводзінах. У выніку – чытанне фарміруе якасці, уласцівыя найбольш развітому чалавеку [6].**

**Разам з тым у шэрагу ўстаноў адукацыі стратэгія псіхолага-педагагічнага забеспячэння чытацкага развіцця, фарміравання культуры чытання не заўсёды адпавядае сучасным патрабаванням. Назіраецца зніжэнне культуры чытання, змяненне яго каштоўнаснага статусу ў свядомасці дзяцей.**

## Трывожныя тэндэнцыі

Ва ўмовах экспансіі экраннай культуры чытанне не проста адыходзіць на другі план, а некаторымі маладымі людзьмі ўспрымаецца як архаізм. Спецыялісты ў галіне чытання сёння адзначаюць наступныя адмоўныя тэндэнцыі:

- доля чытання ў структуры вольнага часу няўхільна скарачаецца;
- чытанне становіцца ўсё больш утылітарным і прагматычным;
- прыярытэт аддаецца забаўляльнаму чытанню;
- традыцыйная кніга як крыніца інфармацыі трапіла ва ўмовы жорсткай канкурэнцыі з электроннымі носьбітамі;
- змястоўнае самаадукацыйнае чытанне становіцца элітарным заняткам.

Названыя тэндэнцыі назіраюцца літаральна ва ўсіх развітых краінах, маюць, так бы мовіць, сусветны характар. Таму сёння агульнапрызнана, што неабходнасць далучэння маладых людзей да чытання, павышэння яго колькасных і якасных характарыстык, фарміравання культуры чытання набыла статус агульнанацыянальнай праблемы. Ад вырашэння яе ў многім залежыць будучыня краіны.

Пераадоленне адзначаных негатыўных тэндэнцый немагчыма без актывізацыі вывучэння чытача і яго чытацкіх паводзін. Сацыёлагі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2009–2010 гг. ажыццявілі маштабнае даследаванне дзіцячага чытання ў краіне. Былі ахоплены ўсе тыпы населеных пунктаў: ад вёсак да буйных гарадоў. Апытанне праводзілася сярод дзяцей малодшага школьнага (7–10 год) і сярэдняга школьнага (11–15 год) узросту. Не засталіся па-за ўвагай даследчыкаў і тыя, хто павінны ўплываць на дзіцячае чытанне: бацькі, педагогі, бібліятэкары. Аналізаваліся сучасны стан чытання дзяцей і падлеткаў, роля сям'і ў фарміраванні ў дзіцяці культуры чытання, меркаванні экспертаў (педагогаў і бібліятэкараў) па вывучаемай праблеме. Вынікі даследавання не толькі пацвердзілі адзначаныя вышэй тэндэнцыі, але і пераканаўча паказалі: уплыў сям'і на чытанне дзяцей зніжаецца з узростам адпаведна яго павелічэнню. Тое ж можна сказаць і пра ўплыў настаўнікаў. У падлеткаў і ўвогуле на першае месца выходзіць аўтарытэт сяброў. А вось бібліятэкар, паводле водгукаў рэспандэнтаў, займае чацвёртае месца ў іерархіі аўтарытэтных для іх дарадчыкаў (незалежна ад узросту апытаных). Апрацаваўшы атрыманыя звесткі, даследчыкі прыйшлі да высновы аб неабходнасці стварэння ў Беларусі дзяржаўнай праграмы падтрымкі і развіцця дзіцячага чытання [8].

У працах беларускіх бібліятэказнаўцаў В. М. Бігезы, Л. А. Дзямешкі, В. А. Какшынскай, А. І. Кукеты, С. А. Паўлавай, І. А. Сталяровай, І. А. Чупраковай і інш. падрабязна разглядаюцца псіхалагічныя і сацыяльна-педагагічныя аспекты дзіцячага чытання, праблемы яго вывучэння і ўдасканалення [7]. Вялікая ўвага надаецца фарміраванню культуры чытання расійскімі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукоўцамі. Напрыклад, В. А. Барадзіна вылучае тры сферы чытацкага развіцця: чытацкую свядомасць, чытацкую дзейнасць і чытацкія зносіны. Яна лічыць культуру чытання ўніверсумам развіцця асобы, разумее фарміраванне культуры чытання як стратэгічную мэту ў чытацкай сацыялізацыі асобы, павышэнні яе творчага патэнцыялу. Культура чытання адначасова з'яўляецца прадуктам і фактарам асобаснага развіцця. Складанасць фарміравання яе ў сучасных школьнікаў заключаецца ў тым, што сёння юны чытач знаходзіцца на перакрыжаванні кніжнай і камп'ютарнай культур пры экспансіі відэакультуры [2].

## Асноўныя паказчыкі культуры чытання

Найбольш поўная, з пункту гледжання бібліятэказнаўства, характарыстыка паняцця «культура чытання» прыводзіцца ў «Бібліятэчнай энцыклапедыі» (2007 г.): яно трактуецца як сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для аптымальнай арганізацыі працэсу чытання, дасягнення яго грамадска значнай накіраванасці, адзін са складнікаў інфармацыйнай культуры асобы. Асноўныя паказчыкі культуры чытання: свядомы выбар тэматыкі чытання, яго сістэматычнасць і паслядоўнасць, здольнасць да адэкватнага ўспрымання і засваення прачытанага, уменне арыентавацца ў бібліятэчным асяроддзі і эфектыўна працаваць з рознымі відамі дакументаў і матэрыялаў, валоданне тэхнікай чытання на ўзроўні, які забяспечвае яго аптымальную хуткасць, ступень засваення прачытанага, падтрымка ў працэсе чытання доўгатэрміновай працаздольнасці, а таксама ўменне знаходзіць патрэбную літаратуру з дапамогай бібліяграфічных дапаможнікаў, уменне карыстацца даведачна-бібліяграфічным апаратам, ужываць рацыянальныя прыёмы пошуку, уменне беражліва абыходзіцца з кнігай і перыёдыкай, выкананне асноўных гігіенічных, фізіялагічных і псіхалагічных правіл работы з кнігай, рацыянальная арганізацыя працэсу чытання [1, с. 547–548].

Разам з культурай працы, культурай побыту і культурай адпачынку культура чытання характарызуе агульную культуру асобы, бо чытанне фарміруе маральнасць і эстэтычны густ, садзейнічае развіццю інтэлекту, мовы, а значыць, і духоўнага патэнцыялу асобы ў цэлым.

Чытанне – гэта сур'ёзная праца, выніковая тэхналогія інтэлектуальнага самаразвіцця, спосаб уключэння чалавека ў сусветную культуру. У адрозненне ад аўдыявізуальных сродкаў камунікацыі, яно патрабуе пэўных намаганняў. У працэсе чытання заўсёды прысутнічае элемент творчасці, таму яго развіццёвая функцыя бясспрэчная.

Чытанне – камунікатыўны працэс. Псіхолагі падзяляюць яго на **тры асноўныя фазы** (этапы).

- **Перадкамунікатыўная** *(матывацыйна-патрэбнасная).* Тое, што папярэднічае чытанню і пабуджае да яго.
- **Камунікатыўная** *(працэсуальна-выніковая).* Гэта сам працэс чытання: успрыманне і разуменне прачытанага, засваенне зместу твора.
- **Посткамунікатыўная** *(выніковаацэначная).* У ёй вылучаюць вынік чытання і ацэнку прачытанага. У псіхалагічным кантэксце іх можна разглядаць і праз паняцці «гатоўнасць – актыўнасць – выніковасць» [2].

Акрамя гэтых трох асноўных фаз, некаторыя аўтары вылучаюць яшчэ дзве. Яны з'яўляюцца адносна самастойнымі, але цесна звязаны з уласна чытацкай дзейнасцю і забяспечваюць яе. Першая **папярэднічае непасрэднаму кантакту чытача з тэкстам**. Гэта ўменне самастойна шукаць неабходную літаратуру, карыстаючыся рознымі крыніцамі, выбіраць канкрэтную кнігу, арыентавацца ў бібліятэчных каталогах і картатэках, базах даных і г. д. Другая фаза ажыццяўляецца **пасля таго, як тэкст прачытаны**. Сутнасць яе заключаецца ва ўменні замацоўваць дасягнутыя вынікі, карыстаючыся разнастайнымі прыёмамі, якія адпавядаюць мэтам і задачам чытання (бібліяграфічнае апісанне, анатаванне, рэферыраванне, складанне плана, тэзісаў, канспектаў, мысленны пераказ прачытанага, асэнсаванне).

Адзначаныя фазы абумоўлены і рэгулююцца матывацыйнай і ацэначнай фазамі чытання. Іх уключэнне ў працэс аналізу спецыфікі чытацкай дзейнасці надае больш шырокі сэнс гэтаму тэрміну. У такім структурным варыянце паняцце «чытацкая дзейнасць» цалкам суадносіцца з паняццем «культура чытання».

## Поле для псіхолага-педагагічнага ўплыву

Спецыялісты ў галіне псіхалогіі чытання лічаць, што аналізаваць чытацкую дзейнасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

можна ў межах наступнай структуры: **веды – уменні – навыкі – майстэрства – мастацтва.** Менавіта такі падыход вызначае поле для псіхолага-педагагічнага ўплыву на павышэнне ўзроўню чытацкай кваліфікацыі і культуры чытання.

Так, С. А. Трубнікаў прапанаваў катэгорыю «культура чытання» ў якасці крытэрыя агульнай тыпалогіі чытачоў. У аснову структуры «культура чытання» ім пакладзена трыяда: выбар, успрыманне, засваенне і выкарыстанне. Адпаведна гэтаму і культура чытання складаецца з трох узаемазвязаных элементаў: культуры выбару матэрыялаў для чытання, культуры ўспрымання тэкстаў і культуры засваення і выкарыстання атрыманай інфармацыі [10].

Узровень сфарміраванасці **культуры выбару матэрыялаў для чытання** характарызуецца наступнымі крытэрыямі: мэтанакіраванасцю, рознабаковасцю, самастойнасцю, структурай установак і матываў выбару, здольнасцю да самарэгуляцыі. Адсюль вынікаюць **педагагічныя задачы** на этапе фарміравання культуры выбару:

- навучыць юнага чытача самастойна і свядома вызначаць мэту чытання;
- навучыць арыентавацца ў разнастайнасці крыніц інфармацыі;
- гарманізаваць структуру яго ўстановак і матываў выбару;
- спрыяць выхаванню здольнасці да самарэгуляцыі, карэктыроўкі выбару, пераадолення прадузятасці ўстановак.

Юнаму чытачу важна не толькі растлумачыць, але і прадэманстраваць, што пошукавыя магчымасці інтэрнэта хоць і вялікія, але далёка не вычарпальныя. У сетцы можна атрымаць хуткі адказ на канкрэтнае пытанне, але па больш глыбокую і сістэматызаваную інфармацыю мэтазгодна звяртацца ў бібліятэку. Тым больш, што пры буйных бібліятэках існуе віртуальная даведачная служба «Спытай у бібліёграфа».

Даследаванні сведчаць, што пашырэнне магчымасцей доступу да інфармацыі не прыводзіць аўтаматычна да актывізацыі яе выкарыстання нават такімі заўзятымі чытачамі, як навукоўцы. Патрэбна мэтанакіраваная дзейнасць па прапагандзе новых інфармацыйных рэсурсаў і навучанні карыстанню імі. Нездарма Нацыянальная бібліятэка Беларусі пастаянна праводзіць адпаведныя курсы, трэнінгі, заняткі для ўсіх жадаючых. Не адстаюць ад яе і дзіцячыя бібліятэкі. Улічваючы спецыфіку сваёй чытацкай аўдыторыі, яны імкнуцца даводзіць да сваіх карыстальнікаў неабходныя веды ў гульнявой форме, а вынікі падводзіць у выглядзе віктарын, конкурсаў, спаборніцтваў.

**Культура ўспрымання літаратуры** ўключае цэласнасць (адзінства рацыянальнага і эмацыянальнага кампанентаў успрымання, інтуітыўнага і дыскурсіўнага спасціжэння зместу і формы, адзінства аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, аналізу і сінтэзу і г. д.) і гнуткасць успрымання, яго адпаведнасць аб'ектыўным якасцям твораў; актыўнасць у асэнсаванні і адэкватнасць у разуменні ідэй і абагульненняў.

Уласна сама культура чытання часам вызначаецца як уменне спасцігаць сэнс напісанага. Прычым чытанне разглядаецца як базавы кампанент вучэбнай дзейнасці, без якога немагчыма забяспечыць паўнавартасны адукацыйны працэс. Таму фарміраванне культуры ўспрымання і разумення тэксту мае метадалагічнае значэнне. І. І. Ціхамірава ў рабоце «Бібліятэчная педагогіка, альбо Выхаванне кнігай» фактычна атаясамлівае культуру ўспрымання з культурай чытання і адзначае існаванне двух мадэлей яе фарміравання: заходняй і расійскай [9].

Першая характарызуецца выключна рацыянальным падыходам да чытання. Мэтамі яе рэалізацыі з'яўляюцца: навучанне прыёмам эфектыўнай работы з тэкстам, спосабам графічнай арганізацыі інфармацыі, структураванню тэксту, фарміраванню ўменняў знаходзіць ключавыя паняцці, складаць план. Такая тэхналогія носіць дзейнасны характар і арыентавана на дасягненні і поспех. У выніку дзеці навучаюцца творча працаваць з інфармацыяй, што дапамагае ім лепш засвойваць вучэбны матэрыял.

Другая мадэль да інтэлектуальнага развіцця дадае духоўна-маральны аспект і накіравана на ўздзеянне не толькі на розум, але і на пачуцці навучэнца, на ўсю сферу яго свядомасці. Мэты яе рэалізацыі: наданне чытанню школьнікаў творчага характару, фарміраванне здольнасці адгукацца на думкі і пачуцці персанажаў і здольнасці выклікаць жыццёвыя асацыяцыі, выхаванне павагі да чалавека, развіццё патрэбнасці падзяліцца сваімі чытацкімі ўражаннямі. Менавіта наяўнасць у юнага чытача такіх якасцей





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забяспечвае маральны і грамадскі ўплыў добрай кнігі на яго свядомасць.

Засвоіць «заходні» алгарытм чытання значна прасцей, чым ажыццявіць выхаванне кнігай, якое патрабуе сапраўднага педагагічнага майстэрства. Авалоданне тэхналогіяй тэкставай дзейнасці як першапачатковым этапам фарміравання культуры чытання павінна ісці поруч з выхаваннем праз кнігу гуманнага, маральнага, творчага, інтэлігентнага чалавека і грамадзяніна.

**Культура засваення і выкарыстання ўспрынятай інфармацыі** прадугледжвае пэўную самастойнасць, аргументаванасць і глыбіню ацэнак і меркаванняў аб прачытаным; перачытванне, звяртанне да іншых кніг гэтага жанру і тэмы; разнастайныя формы зносін па тэме чытання і іншыя віды дзейнасці чытача пад уплывам прачытанага. З пункту гледжання акмеалогіі, культура чытання разглядаецца як сукупнасць дасягненняў асобы ў сферы чытацкай дзейнасці, няўхільнае павышэнне ўзроўню свядомасці чытача і дакладнасці засваення ім інфармацыі, пераўтварэння яе ў веды і, што асабліва важна, – набыццё ўмення карыстацца назапашаным інтэлектуальным і маральным патэнцыялам.

Вялікую ролю ў фарміраванні культуры чытання адыгрывае фактар чытацкіх зносін. Менавіта меркаванні аднагодкаў, густу якіх давярае падлетак, аказваюць найбольш моцны ўплыў на выбар ім кніг для чытання, вызначаюць вектар чытацкіх паводзін. Таму такое важнае значэнне ў аспекце разглядаемай праблемы маюць чытацкія аб'яднанні, клубы па інтарэсах пры дзіцячых і школьных бібліятэках. Фарміраванне спрыяльнага бібліятэчнага асяроддзя стымулюе міжасабовыя зносіны вучняў і, у канчатковым выніку, накіравана на павышэнне культуры чытання, забеспячэнне самаадукацыі і самарэалізацыі юных чытачоў, спасціжэнне праз кнігу і чытанне сацыяльнага і маральнага вопыту, назапашанага чалавецтвам.

Развіццё інфармацыйных тэхналогій патрабуе ад педагогаў і бібліятэчных работнікаў, усіх, хто мае дачыненне да інфармацыйна-дакументнай сферы, распрацоўкі і выкарыстання адпаведных псіхолага-педагагічных тэхналогій чытацкага развіцця дзяцей і падлеткаў, фарміравання ў іх культуры чытання як у шырокім, філасофскім, культуралагічным сэнсе, так і ў плане навучання змястоўнаму, прадуктыўнаму чытанню, выхавання паважлівых адносін да кнігі, бібліятэкі, выпрацоўкі навыкаў чытацкіх зносін, уменняў фармуляваць і выказваць свае думкі, слухаць і чуць суразмоўцу. Іншымі словамі, стратэгія фарміравання культуры чытання павінна спалучаць нашы традыцыйныя каштоўнасці, без якіх немагчыма захаванне нацыянальнай самабытнасці, і заходнія тэхналогіі рацыянальнага чытання, без якіх няма прагрэсу.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Библиотечная энциклопедия** / Рос. гос. б-ка. – М.: Пашков дом, 2007. – 1300 с.
2. **Бородина, В. А.** Теория и технология читательского развития в отечественном библиотековедении: научные и методологические основы / В. А. Бородина. – М.: Школьная библиотека, 2006. – 335 с.
3. **Галактионова, Т. Г.** Чтение школьников как социально-педагогический феномен открытого образования: проблемы исследования / Т. Г. Галактионова // Известия Российского государственного педагогического университета им. А. И. Герцена. – 2006. – Вып. 14. – Т. 6. – С. 177–190.
4. **Добрынина, Н. Е.** По ступеням культуры чтения / Н. Е. Добрынина // Библиотековедение. – 2000. – № 3. – С. 53–57.
5. **Мелентьева, Ю. П.** Чтение, читатель и библиотека в изменяющемся мире / Ю. П. Мелентьева. – М.: Наука, 2007. – 355 с.
6. **Плотников, С. Н.** Социология книги: проблемы и перспективы / С. Н. Плотников // В мире книг. – 1986. – № 11.
7. **Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі** і іх кадравае забеспячэнне: [манаграфія] / У. А. Акуліс і інш.; навук. рэд. С. В. Зыгмантовіч, Н. У. Клімянкова. – Мінск: БДУКМ, 2012.
8. **Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь**: по результатам республиканского исследования / Национальная библиотека Беларуси; сост.: М. Г. Пшибытко, О. В. Гаврилович. – Минск: НББ, 2011. – 155 с.
9. **Тихомирова, И. И.** Библиотечная педагогика, или Воспитание книгой: учебно-практическое пособие для библиотекарей, работающих с детьми / И. И. Тихомирова. – СПб.: Профессия, 2011. – 384 с.
10. **Трубников, С. А.** Культура чтения как критерий общей типологии читателей / С. А. Трубников // Сов. библиотековедение. – 1980. – № 1. – С. 28–38.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ